# ТРЭБА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Між тым Наталля Аляксандраўна спачатку не планавала, што будзе браць у прыёмную сям'ю зусім маленькае дзіця. Увогуле, яны з мужам Мікалаем Іванавічам дамовіліся, што возьмуць да сябе на выхаванне адно ці двух дарослых дзяцей. Вырашылі так праз пэўны час пасля таго, як пахавалі сына, расказвае мама-выхавальніца:

— Нам казалі, што Ваня, які нарадзіўся хворым, пражыве не больш, чым год. А ў нас ён пражыў 17 з паловай гадоў. Калі сына не стала, я не ведала, куды сябе дзець. Прывыкла, што мне трэба клапаціцца пра дзіця. У нас дачка дарослая, у яе свая сям'я, двое ўнукаў падрастаюць... Зімой я мела падпрацоўку, летам дачай займалася. А вось са студзеня па красавік — хоць стукай галавой аб сцяну. Думкі пра дзяцей у мяне былі даўно. А потым неяк селі вячэраць з мужам, і я кажу: «Коля, а што калі нам узяць на выхаванне адно ці двух дзяцей?» Ён нават не раздумваў, адразу ж кажа: «А давай!» Я стала тэлефанаваць, даведвацца, як гэта робіцца. І ўсё закруцілася. Мы прайшлі камісію. Да псіхолага на вучобу ездзіла доўга. Гэта вельмі патрэбна — я там многа зразумела і даведалася. Спачатку мы не думалі аб дзіцячым доме сямейнага тыпу, а потым нам патэлефанавалі з райвыканкама і прапанавалі такі варыянт. Зноў жа раіліся са сваякамі. Гэта ж такая адказнасць! Добра, што самыя блізкія нас падтрымалі. Мы з мужам урэшце далі станоўчы адказ. Ведаеце, былі і тыя, хто нам казаў: «Вам што, не хапіла 17 гадоў, патрачаных на хворага сына?» А ў мяне, відаць, засталося шмат нерэалізаваных пачуццяў, каб дапамагаць іншым дзецям. Гэта — быццам прысвячэнне майму сыну.

Вось такая гісторыя. Ні Наталля Аляксандраўна, ні яе муж не маюць спецыяльнай педагагічнай адукацыі. Дарэчы, Мікалай Агафонаў былы дэсантнік, служыў у Афганістане. Сёння працуе брыгадзірам вытворчага комплексу буйной рагатай жывёлы ў адным з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Самае галоўнае, яны вельмі любяць дзяцей і гатовы ўдасканальвацца самі, каб ім дапамагаць. Дачка і ўнукі таксама паспелі пасябраваць з новымі членамі вялікага калектыву. Прыёмная маці кажа, што ёй пастаянна дапамагаюць і спецыялісты аддзела адукацыі Веткаўскага райвыканкама.

— Восенню, пасля таго, як мы прынялі рашэнне, пазнаёміліся з гэтымі дзецьмі. Удзельнічалі з імі ў розных мерапрыемствах, у тым ліку іх дні нараджэння разам адзначалі. Яны ж самі практычна адразу пачалі мяне клікаць мамай.

Усе юныя жыхары новага дома — з праблемных сем'яў, у кожнага за кволымі плячыма сумны жыццёвы вопыт.

> У мяне, відаць, засталося шмат нерэалізаваных пачуццяў, каб дапамагаць іншым дзецям.

Маці Лізы пазбавілі правоў, калі дзяўчынцы было сем гадоў. Потым яна была пад апекай у сваякоў, але і тыя з выхаваннем не справіліся. Цяпер ёй 15 гадоў, узрост складаны. Але ж, кажа Наталля Аляксандраўна, пакрыху знаходзяць паразуменне. Хоць вучыць прыходзіцца нават элементарнаму. Напрыклад, як посуд мыць, як вады менш расходваць, як выкарыстоўваць сродкі для мыцця. Як выбраць рэжым для прання ў машынцы, колькі насыпаць парашку... У Андрэя гэта трэцяя прыёмная сям'я. Хлопчык імкнецца дапамагаць новым бацькам.

— У мяне пытаецца, у чым дапамагчы. Посуд памые, потым у мужа пацікавіцца, ці дапамагчы. Анечка — дзяўчынка ласкавая, але ж з хітрыкамі. Яе маці пазбаўлена правоў. Пакуль быццам не п'е, але ў яе няма жылля. То з адным жыве, то з другім. Кірылу пяць з паловай гадоў. Ён камунікабельны, лёгкі ў зносінах, не скваппны — усіх цукеркамі з падарункаў надзяляў. Некаторым іншым прыходзіцца растлумачваць, што ў сям'і трэба дзяліцца. У многіх раней рацыён быў такі абмежаваны, што дзеці не разумеюць, як можна проста так есці рыбу, катлеты або салату, — кажа Наталля Аляксандраўна. — Спачатку мы баялася, як дзеці нас успрымуць. Цяпер адчуваем, што малыя нам пачалі давяраць, дзяліцца сваімі сакрэтамі. Яны прынялі нас усёй душой, і гэта галоўнае.

Між тым сям'я будзе папаўняцца. Дом вялікі, амаль 200 метраў квадратных, добра абсталяваны ўсім неабходным, разлічаны на 10 дзяцей, і праз некаторы час так і будзе. Пакуль што ўсе разам рыхтуюцца ўрачыста адзначыць дзень нараджэння самага малодшага:



Сям'я Дамасканавых з Чачэрска.

— Арсенію хутка споўніцца тры гады. Мы для яго зробім свята. Ужо дамовіліся, што купім яму падарунак, торт, свечкі, будзем песні спяваць і фатаграфавацца.

**Намеснік начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму Веткаўскага райвыканкама Таццяна ПОМАЗАВА** гаворыць, што спецыялісты пастаянна кантралююць сем'і, дзеці ў якіх знаходзяцца ў небяспечным становішчы:

— На працягу апошніх гадоў колькасць такіх сем'яў застаецца практычна нязменнай. На ўліку стаіць 53 сям'і, і 130 дзяцей маюць патрэбу ў дапамозе. У нас ёсць прыёмныя, апякунскія сем'і, і цяпер вось два дамы сямейнага тыпу. Сітуацыя ў праблемных сем'ях своечасова адсочваецца, мы абавязкова наведваем іх. Ёсць сем'і, з якіх зняты статус сацыяльна-небяспечных, але яны ўсё роўна пад кантролем. Нават у тым выпадку, калі дзяцей вярнулі.

Між тым падчас адкрыцця другога дзіцячага дома сямейнага тыпу — у Чачэрску **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** нагадаў, што дарослым неабходна зрабіць усё для таго, каб дзеці, пакінутыя без апекі бацькоў, не адчувалі сябе чужымі ў гэтым свеце:

— У вобласці больш як 80% дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, пражываюць у сем'ях — гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у рэспубліцы. Комплекс мер, рэалізаваных дзяржавай апошнім часам, дазволіў значна палепшыць становішча такіх малых. Будучыня дзяржавы залежыць ад таго, хто прыйдзе на змену цяперашняму пакаленню. Таму вельмі важна, каб кожнае дзіця, пазбаўленае бацькоўскай увагі, атрымала магчымасць жыць і выхоўвацца ў доме, дзе ёсць сямейнае цяпло.

Гэта зусім не проста, але ж сужэнцы Марына і Мікалай Дамасканавы, якія заўсёды хацелі мець вялікую сям'ю, нарэшце сталі прыёмнымі бацькамі шасцярых дзяцей і спадзяюцца, што ў іх усё атрымаецца. У Чачэрскім доме сямейнага тыпу зазвінелі галасы чатырох хлопчыкаў і дзвюх дзяўчынак. Самаму малодшаму пяць гадоў, самаму старэйшаму — 16.

Дзіцячы дом сямейнага тыпу ў Чачэрску, як і Веткаўскі, пабудаваны за кошт сродкаў рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. На яго выдаткавана больш за 300 тысяч рублёў. Як вядзецца, на ўлазінах было шмат падарункаў. Вялікай сям'і губернатар уручыў сертыфікаты на набыццё мяккай мэблі і тэлевізара, а Дзед Мароз паклаў пад ялінку цацкі і гульні.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

АХОВА ПАРАДКУ

# УНІВЕРСАЛЬНЫ МІЛІЦЫЯНЕР,

## або Увесь РАУС у асобе ўчастковага

**Прыкладна кожнае пятае злачынства раскрываюць участковыя інспектары міліцыі. Ці хапае ўчастковых у сельскай мясцовасці? А самім участковым, напрыклад, службовых аўто? Як часта здараюцца падчас службы «нестандартныя сітуацыі»? Гэта высвятляў карэспандэнт «МС».**

### Ведаюць усё пра ўсіх

У Віцебскай вобласці больш за 400 участковых. Як адзначылі ва УУС, праблем з кадрамі няма. «Некамплект», як кажуць, рабочы: не больш за 10%.

— Нам ёсць з каго выбіраць — я пра кандыдатаў ва ўчастковыя. Галоўнае не колькасць, а якасць... Па сутнасці, участковы — начальнік міліцыі з усімі адпаведнымі функцыямі і паўнамоцтвамі. Як правіла, першы выязджае па месцы правапарушэння або ў складзе аператыўна-следчай групы, займаецца прафілактыкай злачынстваў, іх раскрыццём і г. д. Практыка паказвае, што там, дзе ўчастковы старанны, ён напрацоўвае вопыт, карыстаецца аўтарытэтам і павагай мясцовых жыхароў, — кажа **начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама, генерал-маёр міліцыі Віктар СЯНЬКО.**

Яскравы прыклад такога «ўніверсальнага міліцыянера» — прадстаўнік Віцебскага РАУС. Два разы, у 2015 і 2016 гадах, старшы ўчастковы інспектар, маёр міліцыі Сяргей Ціханаў перамагаў у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе.

Начальства Сяргея Валер'евіча адзначае, што сакрэт поспеху супрацоўніка — яго зацікаўленасць і мэтанакіраванасць. Сам ён прызнаўся, што ў дзяцінстве марыў стаць менавіта міліцыянерам. Абслугоўвае тэрыторыю, на якой знаходзіцца і яго родны пасёлак Акцябрскі. У міліцыі служыць каля 10 гадоў. Да гэтага пасля віцебскай ВНУ працаваў на прадпрыемстве лёгкай прамысловасці ў абласным цэнтры, потым — галоўным інжынерам у сельскагаспадарчай арганізацыі.

Асаблівасць яго ўчастка ў тым, што недалёка горад. Ды і ў дачны сезон колькасць людзей значна павялічваецца. У «звязцы» з калегам участковы пачаў адпрацоўваць тэрыторыю сельсавета, якая падзелена на два ўчасткі. Эфектыўнае ноу-хау падхапілі іншыя...

### Важная роля прафілактыкі

Кіраўнік УУС адзначае работу ўчастковых па прафілактыцы правапарушэнняў.

— Летась на 3,9% знізілася колькасць злачынстваў па лініі ўсіх нашых службаў, а ў крымінальным вышуку — на 5,2%. На бытавой падставе стала менш забойстваў і цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Зніжана колькасць злачынстваў, учыненых у грамадскіх месцах, у стане алкагольнага ап'янення, непаўналетнімі і пры іх саўдзеле, раней судзімымі...

Шмат у чым гэтаму спрыяла эфектыўная дзейнасць участковых інспектараў міліцыі. У прыватнасці, па накіраванні хранічных алкаголікаў у ЛПП, абмежаванні ў дзеяздольнасці, вынясенні ахоўных прадпісанняў у дачыненні да сямейных дэбашыраў і гэтак далей.

Таксама ўчастковыя раскрылі 4 цяжкія злачынствы. Сярод іх два забойствы, цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое пацягнула смерць, разбойны напад.

Тое, што ўчастковыя могуць быць і ратавальнікамі, даказаў Віктар Зелянеўскі з Лепельскага РАУС. Ён праявіў рашучасць падчас выратавання рыбака, які тануў вясной на возеры. Схапіў прасла плота, прапоўз да палонкі — каля дзесяці метраў ад берага... Капітана міліцыі Віктара Зелянеўскага ўзнагародзілі Ганаровай граматай абласнога Таварыства выратавання на водах.

### Дапамога ад мясцовай улады

У свой час мы пісалі аб праблеме недахопу службовага транспарту для ўчастковых. Ці змянілася сітуацыя?

За ўчастковымі Віцебшчыны сёння замацаваны 102 аўтамашыны: 22 — у гарадской і 80 — у сельскай мясцовасці. Зразумела, «колы» дазваляюць больш эфектыўна сачыць за парадкам. Тым больш, што на многіх участках вёскі знаходзяцца на вялікай адлегласці. А міліцыянерам трэба наведаць састарэлых, каб растлумачыць ім, напрыклад, як не трапіць у пастку махляроў, і іншае...

У Віцебскім аблвыканкаме разумеюць важнасць службы ўчастковых. Губернатар з разуменнем успрыняў адпаведны зварот кіраўніцтва УУС. Паабяцаў падтрымку. Тым больш, што ёсць нагода — сёлета міліцыя краіны святкуе 100-гадовы юбілей.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*